
САКРЭТЫ ПАДЗЕМНЫХ СХОВІШЧАЎ
8

ЯК МІНІМІЗАВАЦЬ ВЫДАТКІ НА ПРЫГАЖОСЦЬ?

12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
19 СТУДЗЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 9 (29378)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай КУШНАРОЎ, дырэктар Дэпартамента прамысловай палітыкі Еўразійскай эканамічнай камісіі:**

*«На дадзены момант ужо падпісаны шэраг пагадненняў і мемарандумаў аб узаемадзеянні ў сферы стварэння сумесных вытворчасцяў вакцыны Расіі з Беларуссю і Казахстанам, наладжаны трансфер адпаведных тэхналогій. Расія ўжо наладзіла выпуск уласных вакцын. Чакаецца, што ў гэтым квартале вытворчасць вакцыны ад каранавіруса пачнецца ў Беларусі. Таксама Расійскі фонд прамых інвестыцый сумесна з казахстанскім бокам у цяперашні момант прапрацоўвае пытанне стварэння новага сумеснага прадпрыемства па вытворчасці вакцын у Карагандзе. Акрамя таго, прамысловым блокам камісіі і РФПІ актыўна абмяркоўваецца пытанне аб удзеле ў развіцці сумесных вытворчасцяў фармвытворцаў Арменіі і Кыргызстана. Аб тэрмінах і формах супрацоўніцтва пакуль казаць рана — у найбліжэйшы час яшчэ трэба правесці шэраг нарад для ўдакладнення дэталяў. Аднак усе бакі разумеюць важнасць аператыўнага вырашэння гэтай задачы, таму можна быць упэўненымі, што неўзабаве ўсе пытанні будуць узгоднены».*

# Вада гаючая і жывая



Сёння амаль у кожным райцэнтры ладзяцца богаслужэнні з нагоды вялікага праваслаўнага свята — у гэты дзень дзве тысячы гадоў таму ў рацэ Іардан адбылося Хрышчэнне Ісуса. У Беларусі свята спрадвеку называюць Вадохрышчам, на азёрах і рэках робяць купелі для абмывання, асвячаюць ваду і набіраюць яе для спажывання. Заходзяць у сцюдзёную ваду, акунаюцца, бо лічаць яе лячэбнай, карыснай для здароўя — цялеснага і духоўнага. Вадохрышча пачынаецца напярэдадні, з першай зоркай, і працягваецца ўвесь дзень дзевятнаццатага студзеня.

Кожны год мне даводзіцца спыняць у часе вадохрышчанскія карціны, бываць на «ярданах» не толькі ў Мінску і ў сталічным рэгіёне, але і ў іншых кутках нашай краіны — у Чачэрску на Святым возеры і ў Шчучыне на гарадскім вадасховішчы, на Скачальскім возеры ў Старадарожскім раёне і ў Лагойску на рацэ Гайна... І кожны раз назіраць, як шануюць і берагуць беларусы вадохрышчанскую традыцыю.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**

Сямейная цеплыня

## ДОМ, ДЗЕ ПАСЯЛІЛАСЯ ЛЮБОЎ,

### або Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго



**Навіна, што сямейны дзіцячы дом у аграгарадку Вялічкавічы Салігорскага раёна ўзнагароджаны прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне», імгненна разнеслася не толькі па вёсцы, але і па ўсёй акрузе. Замяшчальных бацькоў — Андрэя і Таццяну БАРЫТОЛЯЎ віншавалі знаёмыя, сваякі, суседзі, землякі. Словам, тэлефон літаральна разрываўся ад званкоў.** СТАР. 5

Размова па сутнасці

## ВІДАВОЧНАЯ, ДЗЕЙСНАЯ ФОРМА ВЫКАЗВАННЯ АДНОСІН НАШАГА НАРОДА ДА СВАЙГО ПРАВА НА САМАСТОЙНАЕ ГІСТАРЫЧНАЕ ІСНАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ

**Чаго нам чакаць ад Усебеларускага народнага сходу? Якая яго роля ў грамадстве і існуючай рэальнасці? Чаму мы ўскладаем на яго пэўныя надзеі? Пра гэта і пра вопыт, які мы ўжо набылі напярэдадні нацыянальнага форуму, «Звязда» прапанавала паразважаць у фармаце завочнага круглага стала рэктару Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдату гістарычных навук, дацэнту Вячаславу ДАНІЛОВІЧУ, загадчыку кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдату юрыдычных навук, дацэнту Сяргею КАЛІНІНУ, настаўніку геаграфіі сярэдняй школы № 19 горада Гомеля, «Найлепшаму настаўніку года — 2020» Вадзіму ЛОСЕВУ, намесніку дырэктара Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, кандыдату палітычных навук Таццяне ШЭНДЗІК.** СТАР. 6-7

КОРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях з прафесійным святам — Днём ратавальніка.
- **У Беларусі стартуе рэспубліканская акцыя «Бяспека — у кожны дом».**

ISSN 1990 — 763X
21009
9 771990 763008

# Узброеныя Сілы: кампактныя, баяздольныя, гатовыя выканаць пастаўленую задачу

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра абароны Віктара Хрэніна

**На парадку дня — два фундаментальных пытанні: задума і дэталі беларуска-расійскіх вучэнняў «Захад-2021» і вынікі пяцігадовага развіцця Узброеных Сіл краіны.**

Нядаўна кіраўнік дзяржавы даручыў абароннаму ведамству дапрацаваць разам з расіянамі асноўную задуму і нюансы правядзення стратэгічнага вучэння Узброеных Сіл дзвюх краін «Захад-2021». «Для мяне гэта сімвалічна, бо калі быў яшчэ маладым афіцэрам, мне давялося браць удзел у адным з такіх вучэнняў савецкіх Узброеных Сіл у Віцебскай вобласці па адпрацоўцы новых метадаў вядзення вайны, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі я пазнаёміўся з задумай і нюансамі правядзення сёлетніх вучэнняў, убачыў, наколькі ўсё ж такі армія змянілася, наколькі мы прасунуліся наперад».

Беларускі лідар нагадаў, што даўно ўжо дамовіўся са сваім расійскім калегам аб правядзенні гэтых вучэнняў.

Другое пытанне ўчарашняй рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы з міністрам абароны датычылася вынікаў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі за апошнія пяць гадоў.

«Перш за ўсё мы дамаўляліся аб прывядзенні колькасці нашай арміі да пэўнага ўзроўню, — сказаў Прэзідэнт. — Па-другое, мы павінны былі значна ўдасканаліць базу — нашы ваенныя гарадкі, гарнізоны і гэтак далей. Ну і трэцяе — узбраенне. Я ўвогуле ведаю сітуацыю, і някепска, па ўсіх трох кірунках, таму вы сканцэнтруйцеся на тым, на што нам трэба звярнуць увагу ў будучай пяцігодцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Віктар Хрэнін паведаміў, што аператыўная і баявая падрыхтоўка на тэрыторыі суседніх краін расце. «І не толькі на тэрыторыі краін Балтыі і Польшчы, але і на тэрыторыі Украіны, — дадаў ён. — Здавалася б, разрозненыя мерапрыемствы, якія праводзяцца па часе, месцы, але пытанні, што адпрацоўваюцца падчас вучэнняў, прыцягнутыя войскі, аб'екты інфраструктуры, якая ўдасканальваецца, — усё гэта сведчыць пра тое, што краіны Захаду працягваюць шукаць вырашэнне так званага пытання «беларускага выступу».

Адной з самых эфектыўных мер супрацьдзеяння ваеннай пагрозе, якая ўзрастае, з'яўляюцца мерапрыемствы стратэгічнага ўздзеяння, лічыць міністр абароны. Зыходзячы з гэтага беларускае і расійскае ваенныя ведамствы распрацавалі задуму вучэнняў «Захад-2021».

«У аснову задумы сумеснага стратэгічнага вучэння лёг адзін з магчымых варыянтаў эскалацыі ваенна-палітычнай абстаноўкі супраць умоўнай дзяржавы, — паведаміў журналістам па выніках дакладу Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Віктар Хрэнін. — Вучэнні плануецца правесці цягам



Фота БелТА.

сямі сутак з 10 да 16 верасня. Па прапанове нашых расійскіх калег вучэнне пройдзе на тэрыторыі дзвюх краін, што дазволіць нам адпрацаваць пытанні выкарыстання рэгіянальнай групоўкі войскаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі і вядзення армейскіх аперацый».

Падчас вучэння будзе таксама адпрацавана выкарыстанне сумесных штурмавых груп на ўрбанізаванай тэрыторыі, дадзена ацэнка новым і мадэрнізаваным узорам ваеннай спецыяльнай тэхнікі, якая паступіла на ўзбраенне, дадаў міністр.

«У нас з'явіцца магчымасць атрымаць баявы вопыт расійскіх калег, які павялічваецца і які потым можна выкарыстоўваць для ўдасканалення нашых Узброеных Сіл», — падсумаваў Віктар Хрэнін.

Ён адзначыў, што расійска-беларускія вучэнні будуць адлюстроўваць адзінства поглядаў абаронных ведамстваў абедзвюх краін на забеспячэнне ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы.

На пытанне журналістаў пра магчымыя абвінавачанні з боку Захаду ў пагрозе, якую нібыта дэманструюць такія вучэнні, і пра тое, ці будуць запрошаны заходнія назіральнікі, Віктар Хрэнін адказаў: «Яны (абвінавачанні. — **«Зв.»**) ужо з'явіліся, пэўнае іх (заходніх краін. — **«Зв.»**) абурэнне. Але мы, як у складзе Саюзнай дзяржавы і як самастойная дзяржава, маем права вызначаць, якія вучэнні, як і калі іх праводзіць. Вядома, мы запросім (назіральнікаў. — **«Зв.»**), няхай яны глядзяць — мы адкрытыя і гатовыя паказваць стан нашых Узброеных Сіл і ўзровень нашай падрыхтоўкі».

Адносна доўгатэрміновага і сярэднетэрміновага планаў па будаўніцтве і развіцці Узброеных Сіл Беларусі, яны выкананы, паведаміў кіраўніку дзяржавы Віктар Хрэнін.

«У цэлым можна сказаць, што дзякуючы комплекснаму падыходу да выканання ўсіх мерапрыемстваў, якія былі закладзеныя ў планах, дасягнутыя пэўныя поспехі, — пракаментаваў ён потым журналістам. — Асноўныя кірункі, па якіх адбылося будаўніцтва і развіццё Узброеных Сіл, — арганізацыйна-штатныя мерапрыемствы (па дасягненні ўстаноўленай колькасці), утрыманне пэўнай долі новых і сучасных узораў узбраення ваеннай тэхнікі ад агульнай колькасці. Па ўсіх гэтых пытаннях мы пастаўленыя задачы выканалі».

За мінулую пяцігодку на ўзбраенне прынятыя больш за 450 узораў узбраення ваеннай спецыяльнай тэхнікі, капітальна адрамантаваны або мадэрнізаваныя больш за 250 узораў, што забяспечыла немалы ўзровень удзельнай вагі новай і сучаснай тэхнікі, удакладніў Віктар Хрэнін.

Ён нагадаў, што за гэты час былі пастаўленыя на ўзбраенне самалёты Су-30СМ, Як-130, верталёты Мі-8МТВ5, рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз», зенітна-ракетны дывізіён Тор-М2, сучасныя сродкі сувязі, навігацыя, сродкі радыёэлектроннай разведкі, зброя, сродкі абароны для асабовага складу.

«На сёння Узброеныя Сілы кампактныя, баяздольныя і гатовыя выканаць пастаўленую задачу. У цэлым адпавядаюць усім сучасным патрабаванням, якія да іх прад'яўляюць кіраўнік дзяржавы і наш народ», — рэзюмаваў міністр.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Беларусы былі і будуць адным народам»

### Пра гэта Аляксандр Лукашэнка гаварыў на традыцыйным прыёме ў пачатку года

**Прыём ад імя Прэзідэнта прайшоў у суботу ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа». Традыцыйна ён праводзіцца напярэдадні або пасля старога Новага года. На мерапрыемстве з рук кіраўніка дзяржавы атрымліваюць свае ўзнагароды дзеячы розных сфер, якія дасягнулі значных вынікаў.**

«Гэты год прымусіў нас паглядзець на свет і сваё месца ў ім шырока расплюшчанымі вачыма. З аднаго боку, 2020-ы надзеў на нас маскі, з іншага — зняў іх», — сказаў кіраўнік краіны ў сваім выступленні.

Ён адзначыў, што людзі лепш пазналі адзін аднаго — у кімсьці расчараваліся, а ў кімсьці знайшлі апору, убачылі беларусаў, якія ў востры гістарычны момант засталіся вернымі гонару і сумленню, што ў гэты прагматычны век асабліва каштоўна.

«Калі памятаеце, пару гадоў таму ў гэтай зале я сказаў, што ў 19-м і 20-м гадах нас будуць спрабаваць на зуб: вартыя мы ці не сваёй незалежнасці. Час праверыў нас і даў адказ: наогул вартыя, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — ***У 2020-м нам фактычна аб'явілі вайну. І развязана яна была не супраць Прэзідэнта, дзяржслужачых і сілавых структур, а супраць моцнай дзяржавы ў цэлым. Дзяржавы, якая, нягледзячы на сціплае месца на карце свету, можа дазволіць сабе праводзіць незалежную знешнюю і ўнутраную палітыку».***

Менавіта ў гэтым прычына, на думку Прэзідэнта, у выкліку нашай краіне. «Са слабай (краінай. — **«Зв.»**) разабраліся б і без вайны. Калі б мы былі вельмі моцныя, нам бы не прад'яўлялі такія прэтэнзіі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, суверэнітэт краіны немагчымы без моцнай улады (асабліва гэта важна ў час, калі сабраліся перагледзець Канстытуцыю), якую ўвасабляе сабой не адзін чалавек, а нацыя, гатовая згуртавацца, калі дзяржава пад ударам.

***«Мы выстаялі, таму што былі адзіныя ў імкненні захаваць мір і гістарычную праўду, свой уклад жыцця і менталітэт.*** Раскачаліся, праўда, не адразу, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — ***Таму абвешчаны Год народнага адзінства — гэта не столькі задача на будучыню, як неабвержны факт і наш адказ нядобразычліўцам: беларусы былі і будуць адным народам».***

Прэзідэнт заявіў, што беларусы прайшлі праз выпрабаванні, якія зламалі не адзін народ, але ўзялі свой лёс ва ўласныя рукі: ***«Мы прачнуліся. І гэта найлепшае, што магло з намі, беларусамі, адбыцца. Пакуль узялі свой лёс у рукі. Пагадзіцеся, наша родная Беларусь заслугоўвае, каб мы бераглі яе і шанавалі свой нацыянальны статус. Статус грамадзяніна моцнай і незалежнай краіны».***

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Заслужаная нагода для нацыянальнага гонару

**Учора, 18 студзеня, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 18 «Аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года», у якім паведамляецца пра ўзнагароджанне беларускіх калійшчыкаў, анколагаў і скульптара**

Прэмія прысуджана генеральнаму дырэктару «Беларуськалія» Івану Галавацаму, намесніку галоўнага інжынера па горных работах — начальніку ўпраўлення горных работ Андрэю Пятроўскаму, намесніку галоўнага інжынера па перспектыўным развіцці — начальніку аддзела перспектыўнага развіцця Дзмітрыю Барбікаву, намесніку дырэктара па вытворчасці Салігорскага інстытута праблем рэсурсазберажэння з доследнай вытворчасцю Аляксандру Канапляніку, начальніку аддзела галоўнага канструктара — намесніку галоўнага канструктара Дзмітрыю Доўнару і начальніку аддзела вымяральных машын і комплексаў Вячаславу Міхаленю.

«У выніку выкананых аўтарамі даследаванняў і распрацовак створаныя і ўкаранёны новыя тэхналогіі вядзення горных работ па здабычы калійных солей, інтэлектуальныя сістэмы кіравання тэхналагічнымі працэсамі, асвоена вытворчасць сучаснай высокапрадукцыйнай імпартазамяшчальнай тэхнікі для горнай і хімічнай прамысловасці, — сказана ў каментарыі да Указа. — Выкарыстанне новых тэхналогій вымання калійных пластоў дазваляе здабываць з нетраў больш за 80 % запасаў калійных солей (рост на 20 %). Сёння такога паказчыка не дасягнуў ніводны калійны руднік у свеце (у Расіі, Германіі і Канадзе паказчык здабывання не перавышае 40 %). У Беларусі ўпершыню прыменена новая тэхналогія раскрыцця запасаў калійных солей з выхадам на прадукцыйны пласт менш чым за два гады (ужыванне стандартнай схемы займае да шасці гадоў), у выніку капітальныя выдаткі зніжаны ў дзевяць разоў».

Агульны эканамічны эфект ад работы склаў Br993 млн, створана больш за 700 новых рабочых месцаў для высокакваліфікаваных спецыялістаў, інфармуе сайт.

За цыкл работ «Новыя метады дыягностыкі і лячэння анкалагічных захворванняў у дарослых і дзяцей» прэміі ўдастоены дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава Сяргей Палякоў, яго намеснік па навуковай рабоце Сяргей Красны і намеснік па хірургіі Віктар Кахнюк, загадчык лабараторыі таракальнай анкапаталогіі Віктар Малькевіч, галоўны навуковы супрацоўнік РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі Вольга Алейнікава і экс-кіраўнік РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Алег Суконка.

У галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры прэмія прысуджана дацэнту кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Канстанціну Касцючэнку за стварэнне манумента «Брама памяці» ў мемарыяле «Трасцянец».

«Праект «Брама памяці» ўносіць значны ўклад у фарміраванне агульнаеўрапейскай культуры памяці, а таксама ў прымірэнне і паглыбленне ўзаемаразумення паміж народамі. Бронзавая скульптурная кампазіцыя «Брама памяці» не мае аналагаў у сучасным беларускім мастацтве і з'яўляецца выдатнай прафесійнай творчай работай», — сказана ў каментарыі да Указа.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Экспертны асяродак

# «Збіты лётчык» прыцягвае ўвагу

**Некалькі дзён таму ў сеціве з'явіўся ліст няўдалага кандыдата ў прэзідэнты Сяргея Ціханоўскага з СІЗА, адрасаваны аднаму з апазіцыйных журналістаў. У Ціханоўскага цяпер шмат часу, і значную яго частку ён можа аддаць перапісцы, праўда, вялікія сумненні выклікае дакладнасць яго выкладу, тым больш калі ёсць і іншыя сведкі падзей.**

Ціханоўскі спрабуе выглядаць героем, робіць выгляд, што верыць у падтрымку многіх грамадзян і нават прызнаецца, што не чакаў такога спрыту ад уласнай жонкі. Гэта зразумела, чалавеку трэба на нешта псіхалагічна абапірацца ў сітуацыі, у якую ён сам сябе загнаў.

Незразумела і непрыемна іншае — калі ён пачынае разважаць аб нашумелым візіце Прэзідэнта ў СІЗА. Ціханоўскі, падобна, так нічога і не зразумеў: што яму не ўдасца прымерыць на сябе псеўдагераічнае адзенне, што ўсё стане вядома пра паліттэхналагічны праект, часткай якога ён быў.

Хоць, магчыма, тыя, хто гэты праект задумваў, якраз і хацелі выкарыстаць яго ў якасці тарана, раздражняльніка, які збірае вакол сябе незадаволеных і радыкалізуе іх. У шматходовых гульнях такіх персанажаў часта выкарыстоўваюць, праўда, потым часцей за ўсё імі ахвяруюць. Таму ў любой дзяржаве, якая паважае сябе, такія дзеянні і такія палітычныя баі без правілаў заўсёды знойдуць адэкватны адказ.

На ліст Ціханоўскага адгукнуўся яшчэ адзін удзельнік сустрэчы ў СІЗА — Юрый Васкрасенскі, былы актывіст штаба Віктара Бабарыкі, які, у адрозненне ад пагарэлага «народнага трыбуна», аказаўся больш разважлівы, раскаяўся ў дэструктыўнай дзейнасці і нават распачаў стваральную работу па кансалідацыі беларускага грамадства, хоць бы часткі разумнай апазіцыі. Задача нялёгкая, улічваючы, колькі дроў наламана, але ў прынцыпе патрэбная.

Дык вось Васкрасенскі кажа зусім іншыя рэчы, і ўражанні ад сустрэчы ў яго іншыя. Больш за тое, непахвальныя ацэнкі атрымлівае якраз сам Ціханоўскі, калі ў размове з Прэзідэнтам не саромеецца пагражаць яго сыну. Працытуем Васкрасенскага: «Таксама зусім перайначана ў лісце сутнасць размовы з адвакатам. Справа ў тым, што Ціханоўскі ў размове з ім абсалютна канкрэтна і выразна гаварыў пра тое, што «пасадзім малодшага сына Прэзідэнта», называў яго імя. І сустрэчны каментарый адваката, што той непаўнагадовы, яго абсалютна не збянтэжыў. Вядома, Прэзідэнт сказаў пра гэта на сустрэчы, прычым досыць эмацыянальна. А як ён мог адрэагаваць? Толькі чамусьці Сяргей пра гэтыя свае планы ў лісце згадаць забыўся...»

Гэта ўжо нават не пра палітыку — гэта пра звычайную чалавечую мараль і адносіны. Калі нехта дазваляе сабе падобныя пагрозы ў адрас непаўналетніх, якія не маюць дачынення да прыняцця рашэнняў, няхай гэта і малодшы сын Прэзідэнта, то гэта ўжо не палітычная барацьба, гэта самавольства, з якога пачынаецца вар'яцтва грамадзянскага канфлікту.

І дзякуй Богу, што беларусы адышлі ад гэтага краю прорвы. Хоць менавіта за заклікамі да расправы над чыноўнікамі, сілавікамі, журналістамі, якія пачынаў, дарэчы, Ціханоўскі ў рамках сваёй агрэсіўнай інфармацыйнай кампаніі, былі б менавіта прорва, хаос і анархія.

Але ўзнікае заканамернае пытанне: а чаму менавіта цяпер нам раптам зноў нагадалі пра Сяргея Ціханоўскага, чаму яго ліст трапіў да «патрэбнага» журналіста, а ўсе апазіцыйныя СМІ сталі яго цытаваць? У чым справа?

А справа ў тым, што «збітаму лётчыку» Ціханоўскаму вельмі трэба пра сябе нагадваць. Бо нават жонка пра яго не асабліва ўспамінае. А ў асяроддзі палітычнай эміграцыі разгортваецца цяпер самае займальнае — барацьба за рэсурсы і за ўплыў на замежныя цэнтры. Ціханоўскі, Латушка, Цапкала — кожны імкнецца стаць галоўным атрымальнікам заходняй фінансавай дапамогі.

А Сяргей Ціханоўскі, між іншым, ужо і не патрэбны, дакладней, ён патрэбны толькі ў турме, бо ён спрабуе ўплываць на жонку замест літоўскіх спецслужбаў, ствараць канкурэнцыю іншым, якія знаходзяцца на волі, гора-палітыкам. І ён гэта разумее, таму і нагадвае пра сябе гучнымі заявамі.

Але і дадзеная яго піяр-акцыя наўрад ці будзе мець поспех. Пару дзён пашумелі «неверагодныя» СМІ, Васкрасенскі абурыўся адкрытай хлуснёй — і ўсё скончыцца на гэтым. Але Ціханоўскаму варта было б задумацца пра сваю будучыню, тым больш ён яшчэ малады — не, не палітычную будучыню, а пра асабістую і сямейную. У палітыцы ён ужо нічога не даб'ецца з такім рэнамэ, а вось за сям'ю пазмагацца яшчэ можа. Толькі для гэтага трэба пісаць лісты не журналістам, а Прэзідэнту — з раскаяннем і просьбай аб памілаванні. Можа быць, тут яму пашанцуе больш?

**Аляксей ДЗЕРМАНТ.**

Асветніцтва

# ВЫСОКІЯ СПАДЗЯВАННІ

**Кніжнае выдавецтва «Беларусь», чый 100-гадовы юбілей зараз адзначаюць у краіне, — падмурак айчыннага кнігадрукавання. Пра гэта ішла размова і на ўрачыстым сходзе, які прайшоў учора з удзелам намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэя КУНЦЭВІЧА.**




Перадаючы віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, Андрэй Міхайлавіч выказаў шмат цёплых слоў у адрас калектыву-юбіляра. Выдавецтва павіншавала з юбілеем і старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА. З прывітальным словам ад імя Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу выступіла намеснік старшыні парламенцкай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Лілія АНАНІЧ. Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар ЛУЦКІ, адзначыўшы прыярытэты выдавецтва ў дзяржаўным кнігавыдавецтве, асаблівую ўвагу звярнуў на новыя задачы, якія стаяць і перад калектывам «Беларусі», і перад айчыннымі кніжнікамі ў сённяшнім часе. Кніга павінна быць адлюстраваннем памкненняў да народнага адзінства, выразнікам дзяржаўнай пазіцыі ў палітычным, сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, выказаў свае спадзяванні міністр.

Павіншаваць юбіляра прыйшлі калегі па кніжным цэху, ветэраны выдавецтва, пісьменнікі, мастакі, музейныя работнікі, арганізатары айчыннага кніжнага гандлю.

**Сяргей ШЫЧКО.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

*(Працяг тэмы — на 9-й старонцы.)*

На слыху!

# Вакцынацыя ад COVID-19 стане даступнай для ўсіх з вясны

**З красавіка гэтага года ўсе ахвотныя могуць разлічваць на прышчэпку ад COVID-19. Між тым, захваральнасць на пнеўманію ў краіне пакрысе зніжаецца. Пра гэта ў эфіры тэлеканала СТБ расказаў міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.**

— Мы з задавальненнем канстатуем, што і да наступлення свят, і цяпер захоўваецца тэндэнцыя па досыць значным зніжэнні колькасці выпадкаў захворвання на пнеўманію. Гэтая тэндэнцыя даволі ўстойлівая. Аднак з пачатку ці сярэдзіны лютага мы можам убачыць іх невялікі рост, таму што ў гэты час назіраецца традыцыйнае павелічэнне сезоннай захваральнасці, звязанай з грыпам і іншымі інфекцыямі гэтай групы, — сказаў Дзмітрый Піневіч. — У сваю чаргу, гэты рост можа быць згладжаны, бо больш за 40 % насельніцтва было своечасова прышчэплена супраць грыпу. Прычым нікога не трэба было ўпрошваць, залішне інфармаваць — усе ішлі прышчэплівацца самастойна. Тыя, хто не меў супрацьпаказанняў да вакцынацыі і падыходзіў пад нашы крытэрыі, былі правакцынаваны.

Гаворачы пра вакцынацыю супраць каранавіруса, міністр адзначыў, што падпісаны кантракт на 170 тысяч вакцын «Спадарожнік V».

— Гэта першая партыя вакцын, якая да нас паступіла. Яна адпаведным чынам разбіта на некалькі дробных партый. Да новага года мы атрымалі 20 тысяч вакцын, была праведзена праверка іх якасці і бяспекі. Зараз мы працягваем прышчэпліваць медыцынскіх работнікаў. Чакаем, што ў найбліжэйшы час паступіць наступная партыя, і вакцынаваць пачнуць і педагогаў. У першым квартале гэтага года мы сумесна з расійскімі калегамі павінны выпусціць ужо пад беларускім брэндам вакцыну «Спадарожнік V» на магутнасцях айчыннага фармпрадпрыемства «Белмедпрэпараты», — растлумачыў ён.

На пытанне, калі любы ахвотны зможа атрымаць вакцыну, Дзмітрый Піневіч адказаў, што гэта будзе магчыма прыкладна з красавіка: калі скончыцца вакцынацыя ўразлівых груп насельніцтва (медработнікаў, педагогаў, супрацоўнікаў транспарту, гандлю, работнікаў СМІ), тады пачнецца работа з іншымі групамі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# Маразы пратрымаюцца да чацвярга, а далей — хлюпота

**У апошнія гады надвор'е ў нас усё часцей прыносіць нечаканыя сюрпрызы: то халодны сезон без зімы (як у мінулым годзе), то завоблачны «мінус» да 30 градусаў ужо сёлета. Добра яшчэ, што сур'ёзныя маразы ў нас істотна аслабеюць, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Мінулы тыдзень студзеня прымусіў успомніць нават пра валёнкі, бо ў апошні час іх у Мінску практычна не было відаць... А вось у выхадныя яны б спатрэбіліся, тым больш што ў гэтыя дні ў сярэднім адзначалася на 10—15 градусаў ніжэй за кліматычную норму. З 16 да 18 студзеня ўначы тэмпература на большай частцы тэрыторыі краіны апускалася ніжэй за 20 градусаў марозу. Мінімальнае значэнне тэмпературы паветра адзначана ў ноч на 17 студзеня на метэастанцыі Слуцк — мінус 28,7 градуса.

У трэці тыдзень года чакаецца змена ўмоў надвор'я. У пачатку тыдня яшчэ захаваецца марознае надвор'е, але пачынаючы з серады па паўднёвым захадзе, а ў далейшым па ўсёй тэрыторыі краіны будзе адбывацца павышэнне тэмпературнага фону. Затым да канца тыдня тэмпература паветра будзе ў асноўным вагацца ад слабаадмоўных да слабастаноўчых значэнняў, толькі ўначы на чацвер па ўсходзе краіны яшчэ падмарозіць да мінус 13—15 градусаў. Пры павышэнні тэмпературы паветра з сярэдзіны тыдня ападкі будуць ісці ў выглядзе мокрага снегу і дажджу.

Вось так, а пакуль... Сёння ў аўторак раніцай месцамі па краіне пройдзе невялікі снег, удзень будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень 10—16 градусаў ніжэй за нуль.

Затым, пачынаючы з паўднёва-заходніх раёнаў Беларусі, чакаецца аслабленне маразоў. У сераду ўначы па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег, слабая завіруха. Удзень па паўднёвым захадзе прагназуецца мокры снег, магчымы дождж, месцамі галалёд. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу на сераду па краіне будзе розная і складзе 16—23 марозу, пры праясненнях — да мінус 26 градусаў, па паўднёвым захадзе — мінус 9—15 градусаў, у крайніх паўднёва-заходніх раёнах Брэсцкай вобласці — толькі 6—8 марозу. Удзень будзе 6—13 градусаў ніжэй за нуль, па паўднёвым захадзе — ад мінус 5 да плюс 1 градуса.

Далей маразы будуць слабець па ўсёй краіне. У чацвер уначы на большай частцы тэрыторыі, удзень месцамі, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, які будзе пераходзіць у дождж. Месцамі чакаюцца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля па паўднёвым захадзе краіны да 13—15 марозу па ўсходзе краіны, удзень будзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Месцамі чакаюцца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, удзень будзе ад 2 марозу да плюс 4 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне міністру прамысловасці Рэспублікі Беларусь Пархомчыку Пятру Аляксандравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Віктара Аляксеевіча ЦЯРЭШЧАНКІ.**

**Віктар Аляксеевіч быў яркім прыкладам эфектыўнага кіраўніка, браў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы фундаментальных для развіцця беларускай эканомікі і бізнесу дакументаў. Працуючы ў сістэме Міністэрства бытавога абслугоўвання насельніцтва БССР, Віктар Цярэшчанка стаяў ля вытокаў стварэння прадпрыемства, заклікаснага вырашыць шэраг актуальных праблем галіны, якое ў далейшым стала адным з нацыянальных брэндаў, вядомых у многіх краінах свету.**

**Выказваем спачуванне родным і блізкім В. А. Цярэшчанкі ў сувязі з горам, якое іх напаткала, і падзяляем іх смутак.**



VI УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

# «Кадрамі павінны займацца спецыялісты»

**Георгій МАЛІНОЎСКІ, дырэктар Магілёўскага дзяржаўнага прафесійнага агралесатэхнічнага каледжа імя К. П. Арлоўскага:**



— Мяне хвалюе пытанне падрыхтоўкі кадраў: сёння рабочыя кадры і кадры на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі — найважнейшыя ў эканоміцы. І ўстановы накшталт нашай рыхтуюць такіх спецыялістаў. У Савецкім Саюзе сістэма прафтэхадукацыі існавала асобна, яна прагназавала, разглядала падрыхтоўку кадраў на шмат гадоў наперад, займалася ўмацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў і цесна ўзаемадзейнічала з эканомікай. Цяпер такога няма. Але рана ці позна абавязкова вернемся да таго, як было раней. Бо без гэтага няма парадку. У асобных заходніх краінах розныя ведамствы і міністэрствы паспяхова займаюцца падрыхтоўкай кадраў для сябе. У іх ёсць свае адукацыйныя цэнтры, фінансаванне. На іх ляжыць адказнасць за якасць адукацыі і працаўладка-

**«Мы павінны займацца якасцю будучых кадраў і выхаваннем, а на самай справе выконваем яшчэ шмат іншых абавязкаў, што адбіваецца на выніках».**

ванне. Калі ўсё гэта гарманічна ўзаемазвязана, тады і вынік цудоўны. Без гэтага — праблемы. Вось невялікі прыклад. У краіне ёсць аўтаматызаваная сістэма падрыхтоўкі кадраў. Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы павінны ўносіць туды свае заяўкі, а мы, адпаведна, заключаць з імі дагаворы. Але ў гэтай сістэме выстаўляюцца не ўсе прадпрыемствы. У адных праблемы з выхадам у гэтую аўтаматызаваную сістэму, у другіх інтэрнэту няма. А з нас патрабуюць, каб быў выразны баланс паміж тым, што выстаўлена ў гэтай сетцы, і дагаворамі. Мы павінны займацца якасцю будучых кадраў і выхаваннем, а на самай справе выконваем яшчэ шмат іншых абавязкаў, што адбіваецца на выніках. Мы шмат намаганняў прыкладаем да пошукаў мэтавікоў, як толькі пачынаецца новы навучальны год, працуем у гэтым кірунку. І ў нас, у адрозненне ад іншых, заўсёды на 20 жніўня план камплектавання ўжо закрыты. Пастаянна заклікаем моладзь ісці да нас, расказваем пра сябе. Гэта трэба рабіць, але не ў той вялікай ступені, у якой мы вымушаны гэтым займацца. Як і працаўладкаваннем. Мы пачынаем пра гэта клапаціцца, калі малады чалавек яшчэ на першым курсе. Трэба ж знайсці яму цікавую работу. Сёння існуе вялікі дысбаланс паміж тым, што павінна быць для маладых спецыялістаў, і тым, што ёсць. Не заўсёды ім аказваецца матэрыяльная і сацыяльная падтрымка, таму юнакі і дзяўчаты не спяшаюцца затрымлівацца на сваім рабочым месцы.

У краіне абавязкова павінен з'явіцца цэнтр, які будзе спецыялізавацца на прафтэхадукацыі, а ў абласцях — упраўленні па прафесійнай падрыхтоўцы кадраў. І там павінны працаваць спецыялісты з адпаведнай адукацыяй. Тады і куратарства будзе рацыянальнае. Наладзіцца прагназаванне падрыхтоўкі кадраў праз адпаведныя галіны эканомікі на шмат гадоў наперад. І матэрыяльна-тэхнічная база стане больш магутная і сучасная. Я не кансерватар, але лепш за тую сістэму падрыхтоўкі кадраў, што была ў Савецкім Саюзе, не прыдумаеш. Не трэба павялічваць колькасць чыноўнікаў, неабходна правільна арганізаваць працэс.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «Толькі ад нас залежыць, як мы будзем жыць надалей»

**Алена ГРЭЧНАЯ, студэнтка пятага курса Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Біялогія (па кірунках)»:**



— Усебеларускі народны сход — гэта пляцоўка, якая спрыяе празрыстасці ў развіцці беларускай палітыкі. Удзел у ім дае магчымасць падзяліцца ўласнымі думкамі па многіх пытаннях, — лічыць яна.

21-гадовая дзяўчына — адна з дэлегатаў ад Брэсцкай вобласці на VI Усебеларускі народны сход, вылучаная Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі.

— Для мяне сапраўдны гонар — быць датычнай да такой падзеі. Як прадстаўнік моладзі бачу для сябе магчымасць паўплываць на рашэнне важных пытанняў развіцця сваёй краіны, сваёй вобласці. Сёлета заканчваю навучанне ва ўніверсітэце і адной з самых актуальных тэм на дадзены момант лічу скарачэнне рабочых месцаў у маленькіх гарадах і асабліва ў сельскай мясцовасці. Упэўнена, што развіццё сялянска-фермерскай гаспадаркі і індывідуальнага прадпрымальніцтва можа дапамагчы выправіць гэтую сітуацыю.

**«Адной з самых актуальных тэм на дадзены момант лічу скарачэнне рабочых месцаў у маленькіх гарадах і асабліва ў сельскай мясцовасці».**

Алена Грэчная — старшыня Маладзёжнага парламента Пінска, уваходзіць у склад Маладзёжнага парламента Брэста, да нядаўняга часу займала пасаду кіраўніка Каардынацыйнага савета і старшыні Студэнцкага савета біятэхналагічнага факультэта свайго ўніверсітэта, уваходзіла ў склад Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета пры Міністэрстве адукацыі. Акрамя таго, дзяўчына — пераможніца рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2019» у ПалесДУ, а таксама «Студэнт года — 2019» online Брэсцкай вобласці, брала ўдзел у шматлікіх адкрытых дыялогах БРСМ, двойчы была запрошана на Прэзідэнцкі баль, удзельнічала ў адкрыцці рэспубліканскага свята — Маладзёжнай сталіцы — у Оршы і Пінску. Акрамя таго, актыўна займаецца валанцёрскай дзейнасцю, з'яўляецца членам Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа пры ПалесДУ.

— Якой стане будучыня Беларусі, наколькі грамадства будзе інтэлігентнае, адукаванае, шмат у чым залежыць ад маладога пакалення. Наша краіна багатая на традыцыі, і разам з тым яна хуткімі крокамі рухаецца наперад. Упэўнена, толькі ад нас залежыць тое, як мы будзем жыць надалей. Правядзенне VI Усебеларускага народнага сходу пасадзейнічае вырашэннюназапашаных у грамадстве пытанняў. Мы павінны падвесці пэўныя вынікі і зрабіць высновы на кожным этапе развіцця за апошні перыяд часу, вызначыць кірункі развіцця беларускай эканомікі і сацыяльнай сферы.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# Дзеля будучыні дзяцей!

**Ірына ЕЛЕНСКАЯ, старшыня Віцебскага абласнога Савета грамадскага аб'яднання «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя», метадыст аддзела сацыяльных праектаў і маладзёжных ініцыятыў дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі», член прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі:**

— Вы толькі ўявіце, 2700 дэлегатаў прыедуць з усіх куткоў нашай краіны на VI Усебеларускі народны сход. Ганаруся, што я ў іх ліку буду прадстаўляць любімую Віцебскую вобласць. І, як усе дэлегаты, маю магчымасць рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права ўдзельнічаць у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця краіны.

Упэўнена, што гэта будзе эпахальная падзея ў гісторыі беларускай дзяржавы і грамадства.

Там будуць падведзены вынікі, абазначана ўсё дасягнутае. І, безумоўна, ад Усебеларускага народнага сходу мы чакаем ацэнкі кірункаў развіцця: па якім шляху будзе развівацца Беларусь і якія будуць вызначаны арыенціры на будучыню!



**«Важная тэма — і прыняцце дзяржаўнай праграмы па развіцці медыйнай прасторы для дзяцей і падлеткаў».**

У нашай краіне чаканні грамадства ў дачыненні да моладзі вельмі вялікія. Дыялогавыя пляцоўкі, якія былі арганізаваны ГА «БРСМ» у вобласці, выразна акрэслілі асноўныя хвалюючыя для нашай моладзі пытанні і кірункі.

Гэта, напрыклад, фарміраванне патрыятызму і грамадзянскай самасвядомасці, стварэнне прывабных умоў для замацавання моладзі на вёсцы, павелічэнне ўзросту «статусу» прадстаўніка моладзі да 35 гадоў, распрацоўка праграм замежных стажыровак і г. д.

Мяне як кіраўніка абласной структуры ГА «БРПА» хвалююць такія пытанні, як стварэнне дзяржаўнага органа (дэпартамента) па рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, рэспубліканскага рэсурснага цэнтра па суправаджэнні дзіцячага і маладзёжнага руху... Важная тэма — і прыняцце дзяржаўнай праграмы па развіцці медыйнай прасторы для дзяцей і падлеткаў (спецыялізаваных дзіцячых адукацыйных, тэле-, YouTube-каналаў)...

Мы ўсе настроены на стваральную працу ў імя будучыні, будучыні сваіх дзяцей, у імя будучыні нашай любімай Беларусі!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДОМ, ДЗЕ ПАСЯЛІЛАСЯ ЛЮБОЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Для нас было нечаканасцю, што мы ўдастоены такога гонару. Мы ніколі не думалі пра ўзнагароды — з раніцы да вечара ў клопатах аб дзецях. А ўзнагарода з рук самога кіраўніка дзяржавы — гэта найвышэйшая адзнака нашай работы, — кажа Тацццяна Міхайлаўна.— І калі нам паведамілі пра гэтую падзею, нават не верылася, пакуль не паехалі за прэміяй. Ведаеце, я ўпершыню сустрэлася з такой цёплай, утульнай атмасферай, якая панавала падчас урачыстай цырымоніі.

— А на што патраціце грошы? — цікавілася ў суразмоўніцы.

— Летам, калі ў дзяцей будуць канікулы, хочам пападарожнічаць па Беларусі. Ужо і маршрут спланавалі. Паездку арганізуем з начлегам на берагах рэк, азёр — словам, своеасаблівы турпаход.

— Дык месцаў на ўсіх у машыне не хопіць...

— Было б жаданне, а магчымасць заўсёды знойдзецца. У нявесткі, зяця, сына ёсць легкавікі.

З-за дзвярэй за намі цікуюць маленькія хлопчык і дзяўчынка.

— Унукі Рома і Паліна, — знаёміць з малымі бабуля. — Гэта дзеці нашай прыёмнай дачкі. Спачатку мы ўзялі хлопчыка Валеру, а затым забралі яго брацiка і сястрычку. Яны ўжо дарослыя, маюць сем'і, але не забываюць нас з бацькам. Валерыю ўжо 25 гадоў, працуе на рудніку «Беларуськалія». Ілы — 20 гадоў, вывучыўся на механіка, жыве ў Петрыкаве. А дзве прыёмныя дачкі закончылі педагагічны і медыцынскі каледжы.

Усяго ж цяпер у сям'і Барытоляў дзевяць прыёмных дзяцей і свой роднага сын Уладзіслаў, які праходзіць тэрміновую вайсковую службу. Нядаўна ажаніўся, але малымі пакуль не абзавёўся.

Самая старэйшая дачка — Насця, ёй споўнілася шаснаццаць гадоў, за ёй ідзе 15-гадовы Ягор.

— Мяне тата з мамай забралі да сябе восем гадоў таму, — кажа дзяўчына. — Мне пашчасціла, што трапіла ў гэту сям'ю.

— У нас вельмі ўтульна ў доме, стараемся ва ўсім дапамагаць бацькам, вечарам за адным вялікім сталом п'ём чай з выпечкай, гуляем у шахматы, — дадае хлопец.



Ягор любіць катацца на лыжах, наведвае секцыю па валейболе, марыць паступіць у Салігорскі горнахімічны каледж, каб стаць шахцёрам. Насця пакуль не вызначылася з будучай прафесіяй. Кожны раз меркаванне мяняецца: то хоча быць дызайнерам, то фармацэўтам. Яна добра малюе, спявае.

— Як вы спраўляецеся з такой кагортай выхаванцаў? — цікавілася ў бацькоў.

— Узаемадапамога, выручка па прынцыпе: адзін — за ўсіх, усе — за аднаго, — лічыць бацька Андрэй Іванавіч, які працуе вадзіцелем у аддзеле па надзвычайных сітуацыях.

— Старэйшыя дзеці дапамагаюць. Стараюцца ўзяць малых, пагуляць з імі, каб я магла адпачыць, — кажа Тацццяна Міхайлаўна.

— А як усіх накарміць? У кожнага, відаць, свой смак, гастранамічныя перавагі?

— Гатую я сама, паколькі па спецыяльнасці кухар. Але дзяўчынкі пастаянна ўвіхаюцца каля мяне, цікавяцца, ці патрэбна дапамога. Ім падабаецца назіраць за працэсам гатавання ежы, вучыцца.

А вось на дзень нараджэння імянніннікі выказваюць пажаданні, што хацелі б бачыць на святочным стале, што ім падабаецца.

У кожнага з дзяцей свае схільнасці, таленты. Насця захапляецца шытвом, ёй падабаецца прыдумваць новыя мадэлі адзення. Ангеліна і Аня больш любяць займацца лыжамі. Паліна добра малюе. А хлопцы больш схільныя да спорту. Любяць яны бываць з бацькам у гаражы. Андрэй Іванавіч вучыць іх рамантаваць тэхніку, нешта майстраваць.

Звычайна бацькі хочуць, каб іх дзеці атрымалі вышэйшую адукацыю, вучыліся і працавалі за мяжой. А Тацццяна Барытоль лічыць, што галоўнае, каб яны выраслі прыстойнымі людзьмі, каб былі шчырыя, любілі людзей, сваю Радзіму, каб у іх не было злосці, каб яны не шукалі нейкі негатыў, каб ва ўсім знаходзілі радасць, каб бачылі больш плюсоў і неслі свято. А да вучобы ў кожнага свае здольнасці. Дворнік — таксама пачэсная прафесія. Галоўнае — быць добрым, светлым, пазітыўным чалавекам, лічыць маці.

Як прызнаецца жанчына, яна не засмучаецца, калі хтосьці з гадаванцаў часам атрымае дрэнную адзнаку, не сварыцца на іх, бо ім і самім сорамна. «Нічога, назбіраем «калоў», будзем новы плот ставіць, «двоек» — гусей разводзіць», — пакеплівае над вучнямі Тацццяна Міхайлаўна. У дзяцей самiх ёсць стымул добра вучыцца. Яны глядзяць адзін на аднаго і стараюцца.

Святаслаў моцны ў матэматыцы, а вось Ангеліне гэты прадмет даецца цяжка. Яны вучацца ў адным класе. Неяк дзяўчынка прыходзіць дамоў і скардзіцца маме, што ў яе будзе два балы па кантрольнай рабоце, таму што Святаслаў не даў ёй спісаць. Маўляў, не даў падгледзець сястры, а свайму сябру дазволіў. «Таму гэта нармальна, дзіця павінна быць дзіцем, пражыць жыццё дзіцяці. Не атрымалася цяпер па кантрольнай, атрымаецца ў наступны раз. Яно асэнсавала сваю памылку і ў далейшым не наступіць на адны і тыя ж граблі», — сцвярджае маці.

— А ці здараецца, што дзеці нашкодзяць? Як ставіцеся да гэтага? — удакладнілі ў гаспадыні.

— Яны стараюцца не засмучаць мяне. Але дзеці ёсць дзеці, бывае і нашкодзяць у нечым. Тады забараняю на пэўны час глядзець тэлевізар, карыстацца ноўтбукам. Неяк даведалася, што дзяўчынкі глядзелі тэлевізар да чатырох гадзін раніцы. Забараніла ўключаць. Прыходзіць Ангеліна і цікавіцца, калі ж закончыцца пакаранне. Добра, глядзіце, кажу ім. «А ты, мамачка, не ўмееш караць, раніцай забараніла, а вечарам дазволіла».

— Нядаўна прачытала ў інтэрнэце меркаванне жанчыны, што нельга любіць чужых дзяцей. Любіць можна толькі сваіх, якіх выносіла пад сэрцам...

— Так, не кожнаму гэта дадзена. У нас шмат знаёмых, якія сцвярджаюць, што ніколі б не змаглі прыняць чужое дзіця. Я ж кожнага са сваіх прыёмных трымаю ў галаве, нават калі спаць кладуся. Калі дзіця не адчувае гэтай любові, то з яго нічога не будзе. Мы не бяром дзяцей з сям'і міністра. Да нас прыходзяць малыя з параненай душой, якія перажылі здраду, боль. І каб дзіця вырасла маральна і псіхічна здаровай асобай, трэба даказаць, што яго любяць не на словах. Неабходна прытуліць, каб яно зразумела, што яно любае ў сям'і. Думаю, што дзеці адчуваюць мае адносіны да іх. І адказваюць удзячнасцю — робяць прыгожыя паштоўкі, на іх пішуць, як мяне любяць, наколькі я ім дарагая. Гэта настолькі шчырыя словы, што я па некалькі разоў іх перачытваю.

— А ад дзяржавы атрымліваеце нейкую дапамогу?

— Бясспрэчна. Не заўсёды ўсё бывае гладка, даводзіцца звяртацца ў органы апекі. Заўсёды прыходзяць на дапамогу, у любы час сутак можна ім патэлефанаваць, і заўсёды знойдзеш падтрымку, параду, адказ на любое пытанне. Аднойчы ў нас была складаная сітуацыя, не ведалі, як з яе выйсці, звярталіся да псіхолагаў. Яны самі прыязджалі да нас, працавалі з адным з выхаванцаў.

Дзякуючы дзяржаве мы атрымалі і гэты дом. Яго будавалі яшчэ тады, калі мы былі прыёмнай сям'ёй. Мы прыязджалі, глядзелі, як ідзе яго ўзвядзенне.

Дзеці вырастаюць, пакідаюць роднае гняздо. За столькі гадоў бацькі зразумелі, што гэта не толькі іх работа, але і прызванне — дапамагаць дзецям.

— Мы адказныя за іх выхаванне, за тое, якімі яны ад нас сыдуць у вялікі свет. Дык чаму б не дапамагчы яшчэ камусьці вырасці прыстойным чалавекам.

На развітанне нас з усёй сям'ёй праводзіў усеагульны любімец — маленькі дэкаратыўны той-тэр'ер Тобі.



— Гэта ўся наша гаспадарка, — пажартавалі Тацццяна Міхайлаўна і Андрэй Іванавіч. — А коціка не завялі. У нас іх — хоць адбаўляй. З усёй акругі прыходзяць бадзяжныя ваські ды муркі, бо ўсіх шкадуем, кормім. Ды і ад зносін з жывёламі дзеці становяцца дабрэйшымі.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

Да ведама

# Праграма «Настаўнік для Беларусі» чакае «навабранцаў»

**Кожны навучэнец мае права на якасную адукацыю, але яго рэалізацыі немагчыма дасягнуць без актыўных, матываваных, мэтанакіраваных і таленавітых педагогаў. Менавіта таму і з'явілася праграма «Настаўнік для Беларусі». Праект разлічаны на тых, хто не баіцца новага і верыць, што кожнае дзіця павінна мець шанц на развіццё свайго патэнцыялу.**

Паўдзельнічаць могуць не толькі выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў і вопытныя настаўнікі: з гэтага года праграма даступная для ўсіх уладальнікаў дыпломаў аб вышэйшай адукацыі — ёсць магчымасць прайсці адпаведную перападрыхтоўку ў магістратуры БДПУ.

Зараз у рэгіёнах выкладае ўжо больш за 30 «настаўнікаў для Беларусі» (дзевяць удзельнікаў першага набору і 22 — другога), праграма ахапіла літаральна ўсю краіну (19 школ-партнёраў). Педагогі бяруць удзел у міжнародных конкурсах, хакатонах і фестывалях, эксперыментуюць з дыстанцыйным навучаннем, праводзяць анлайн-летнікі і ставяць спектаклі (апошнія — з удзельнікамі праекта «Праз тэатр», які зладзіла IT-кампанія «Вайзор Геймз»).

У бягучым годзе фонд «Новая школа» плануе набраць новых «настаўнікаў для Беларусі», каб пашырыць сваю прысутнасць у рэгіёнах і стварыць унікальныя адукацыйныя магчымасці для яшчэ большай колькасці дзяцей.

«Настаўнікі для Беларусі» павінны будуць выкладаць на стаўку на працягу двух гадоў і працаваць над праектам, важным для дзяцей і мясцовай супольнасці. Фонд «Новая школа», заснаваны БПС-Ашчадбанкам, кампенсуе выдаткі на жыллё і гарантуе ўдзельнікам штомесячную стыпендыю ў памеры 250 рублёў. Партнёры праграмы — анлайн-гіпермаркет 21vek.by і EPAM Systems — забяспечваюць ноўтбукам для работы.

Другая хваля набору працягнецца да 28 лютага 2021-га ўключна. Даведацца аб падрабязнасцях можна на сайце http://teach4.by/uchastnikam.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Відавочная, дзейсная нашага народа на самастойнае гістарычнае

## УНС як палітычны феномен


Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.


Сяргей КАЛІНІН.


Вадзім ЛОСЕЎ.


Таццяна ШЭНДЗІК.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Усебеларускі народны сход — адна з найважнейшых формаў прамога народаўладдзя ў Рэспубліцы Беларусь. Форма, якая прадугледжвае абмен думкамі, кансультацыі, раду органаў улады з народнымі прадстаўнікамі па актуальных для грамадства і дзяржавы кірунках развіцця, праблемных пытаннях. Традыцыя падобных сходаў цалкам адпавядае нашаму менталітэту і ўзыходзіць яшчэ да старажытнаславянскага веча. Асаблівае значэнне Усебеларускі народны сход набывае ва ўмовах геапалітычнай нестабільнасці і пагроз дзяржаўнаму ладу краіны.

Разам з тым Усебеларускі народны сход — гэта відавочная, дзейсная форма выказвання адносін нашага народа да свайго права на самастойнае гістарычнае існаванне і развіццё. У адпаведнасці з гэтым воля дзяржавы, воля яе палітычных інстытутаў, у тым ліку выяўленая ў Канстытуцыі, любых іншых законах, не можа быць вышэйшай за волю самога народа. Таму ўнікальнасць Усебеларускага народнага сходу ў тым, што яго работа дае магчымасць інстытутам улады сувымяраць і суадносіць сваю палітыку па ўмацаванні і развіцці дзяржаўнасці, з воляй яе носьбіта. У гэтых адносінах прыняцце любых законаў (у тым ліку Асноўнага Закона), накіраваных на практычнае гістарычна перспектыўнае забеспячэнне існавання і развіцця беларускага народа, з'яўляецца выключна яго прэрагатывай.

> **Відавочна, што ўсе мы хочам развіцця, росту заробкаў, больш якасных паслуг жыллёва-камунальнай гаспадаркі, змяншэння падатковага цяжару... Гэта супер! Гэта класная ідэя, але дэклараваць іх недастаткова.**

На маючым адбыцца VI Усебеларускім народным сходзе я вынес бы на абмеркаванне яго дэлегатаў пытанні не толькі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступную пяцігодку, але і ажыццяўлення канстытуцыйнай рэформы, нацыянальнай кансалідацыі перад тварам актуальных геапалітычных выклікаў.

**Сяргей КАЛІНІН:** Калі гаварыць аб сучасных праблемах дзяржаўнага будаўніцтва і дэмакратыі, у першую чаргу трэба прытрымлівацца разумнай крытычнасці і мецы на ўвазе наступнае.

Першае. Такая канцэпцыя фарміравання і рэалізацыі ўлады генетычна мае заходнія карані і адносіцца да ліберальнай культуры, для якой характэрна безапеляцыйнае прызнанне ўласных узораў і ідэй у якасці ўніверсальных. Але тут узнікаюць пытанні, наколькі палітыка-прававыя мадэлі, уласцівыя адной цывілізацыі, падыходзяць да іншых, ці могуць незаходнія дзяржаўнасці выкарыстоўваць іншыя формы народаўладдзя, чым прадугледжаныя заходняй традыцыяй, дамінаванне якой можна разглядаць і як форму культурна-ідэалагічнай інтэрвенцыі, палітычнага расізму, які адмаўляе іншым народам у самастойнасці і развіцці.

Другое. Кожны палітыка-прававы тэрмін мае шматгранныя значэнне. Напрыклад, пры апалогіі дэмакратыі традыцыйна выкарыстоўваецца недакладная цытата з Уінстана Чэрчыля, якая ў арыгінале гучыць так, «на самай справе, можна казаць, што яна [дэмакратыя] найгоршая форма праўлення, калі не лічыць усіх астатніх, якія былі выпрабаваны часам». Пры гэтым Чэрчыль, які з'яўляецца прамым нашчадкам першага герцага Мальбара і ўнукам пятага герцага, але ад другога сына, кажа пра дэмакратыю праз гледжанне шляхетнага джэнтльмена.

Але народ не абмяжоўваецца толькі арыстакратычнымі джэнтльменамі, якія іншых не прызнаюць вартымі і годнымі сябе, таму трэба ўлічваць розніцу паміж канцэптам і рэчаіснасцю, так сказаць, правяраць гармонію алгебрай, а тэорыю гісторыяй.

Мяркую, любы народ можа выкарыстоўваць розныя формы прадстаўніцтва, найбольш адэкватныя патрабаванням часу і тым выклікам, якія час прад'яўляе таму народу і яго дзяржаўнасці. Таму трэба паралельна згадаць гісторыю развіцця прадстаўнічых органаў, у якой заходні палітыка-прававы вопыт — гэта толькі адзін з кірункаў.

У любой цывілізацыі, у любой краіне і ў любога народа прысутнічаюць і ўзаемадзейнічаюць некалькі ўзроўняў улады: аднаасобная, арыстакратычная (кампетэнтнай меншасці), дэмакратычная (улада народа, народнага сходу) і сакральна-ідэалагічная, якая вызначае сэнс існавання дзяржавы. Таму кіраванне аб'ектыўна забяспечваецца супрацоўніцтвам кіраўніка і савета найбольш кваліфікаваных, падрыхтаваных, мудрых і г. д., адносіны якіх залежаць ад гістарычнага кантэксту, традыцый і т. п. Адначасова пры кіраўніку ствараецца прафесійны апарат службовых асоб, які непасрэдна і атаясамліваецца з уладай. Народны сход забяспечвае легальнасць дзеяў і кантралюе дзейнасць пастаянных органаў, прадстаўляе інтарэсы шырокіх мас. Сакральна-ідэалагічная ўлада (рэлігія) захоўвае светапоглядныя нормы, чым абмяжоўвае дзейнасць кіруючых структур.

Важнай сучаснай сусветнай тэндэнцыяй развіцця парламентарызму з'яўляецца падзенне ролі парламента і пераход магчымасцяў прыняцця рэальных рашэнняў да апарату кіравання. Гэта абумоўлена ўскладненнем сацыяльных працэсаў, для разумення якіх трэба быць прафесіяналам. Дэпутат жа можа быць кампетэнтным толькі ў адной сферы, што і абумоўлівае аб'ектыўнае абмежаванне ролі парламента і ўзмацненне ролі выканаўчай улады.

На гэты працэс падмены бюракратыяй ролі прадстаўнічых органаў звярнуў увагу і Макс Вебер, які прапанаваў мадэль плебісцытарнай дэмакратыі, калі кіраўнік дзяржавы можа непасрэдна звярнуцца да народа, правесці плебісцыт па найбольш значных пытаннях, так сказаць, «праз галаву прафесіяналаў у галіне кіравання», якія могуць выдаваць уласныя інтарэсы за дзяржаўныя.

Адначасова развіццё парламентарызму выявіла і іншую негатыўную тэндэнцыю — фарміраванне дыктатур партыйных кіраўнікоў і іх сувязь з лабісцкімі структурамі, калі палітычныя партыі перасталі прадстаўляць інтарэсы шырокіх колаў насельніцтва, а фактычна выступалі ў інтарэсах вузкага кола партыйнага апарату.

Усё гэта патрабуе наяўнасці і іншых формаў народнага прадстаўніцтва, якія адначасова не павінны падмяняць сабой парламент, адзін з найбольш важных органаў улады, праз які фарміруецца палітычны дыскурс, да выканаўчай улады даводзяцца структураваныя інтарэсы насельніцтва, праз парламенцкія слуханні ажыццяўляецца кантроль. Гэта пацвярджае важнасць такой ужо традыцыйнай формы народнага прадстаўніцтва, як Усебеларускі народны сход, статус якога мэтазгодна замацаваць у Канстытуцыі.

> **Трэба выкарыстаць усе алоўкі ў гэтым пачку, якія называецца «дэмакратыя па-беларуску», каб зразумець, што нам дапаможа. Ці рэалізавалі мы ўсе магчымыя варыянты, каб прыйсці да грамадскага кансэнсусу і, самае галоўнае, да паляпшэння жыцця грамадства?**

Але Усебеларускі народны сход не з'яўляецца парламентам і не падмяняе яго ролю. Розніца гэтых інстытутаў добра бачная на гістарычных прыкладах. Так важную ролю ў развіцці прадстаўнічых органаў выконвала хрысціянства, у якім таксама прысутнічае і аднаасобная (епіскапальная) і калектыўная (саборная) формы кіравання, суадносіны якіх залежаць ад пэўнай канфесіі. Каталікі аддаюць перавагу аднаасобнай форме ў асобе непагрэшнага ex cathedra рымскага першасвятара, праваслаўныя сумяшчаюць гэтыя формы, бо над кожным патрыярхам і епіскапам стаіць Сабор.

Традыцыя склікання сабораў зыходзіць да апостальскіх часоў. Паступова традыцыі царкоўных сабораў успрымаліся і свецкімі ўладамі, асабліва ў Заходняй Еўропе, дзе кароль вымушаны быў склікаць саслоўі для вырашэння найбольш значных праблем. Гэта прывяло да фарміравання парламента ў сучасным разуменні як пастаяннага органа, які прадстаўляе перад каралём інтарэсы розных груп народа і ў якім прыняцце рашэнняў ужо не патрабуе агульнай згоды, а можа быць толькі праз арыфметычную большасць. Дзейнасць такога парламента і абумовіла фарміраванне палітычнай сістэмы. Але трэба памятаць вышэйпрыведзеныя словы Уільяма Чэрчыля аб дэмакратыі і джэнтльменах...

Такім чынам, Усебеларускі народны сход фактычна трэба разглядаць як спробу рэалізацыі пэўных саборных пачаткаў, калі мэтай з'яўляецца высвятленне існуючых праблем і пошук шляхоў іх пераадолення. Таму і фарміраванне такога органа павінна ажыццяўляцца на іншых прынцыпах, у ім павінны быць прадстаўлены максімальна шырокія колы і групы насельніцтва. Мэтай дзейнасці такога органа павінна быць не столькі партыйная барацьба ў шырокім сэнсе, колькі фарміраванне сацыяльнага кансэнсусу, дыягностыка грамадскіх праблем і прычын, якія іх парадзілі, пошук балансу інтарэсаў розных груп насельніцтва, тэрыторый і г. д. Таму рэгулярнае скліканне Усебеларускага народнага сходу будзе спрыяць развіццю дэмакратыі ў Беларусі.

## Логіка беларускай мадэлі развіцця

**Таццяна ШЭНДЗІК:** Рэспубліка Беларусь адбылася як суверэнная незалежная дзяржава, падзеі 2020 года не пакінулі ў гэтым сумневаў.

Толькі сфарміраваўшы нацыянальную дзяржаву, беларускі народ увасобіў у жыццё шматвяковую нацыянальную ідэю: «Людзьмі звацца!» Паклаўшы ў аснову дзейнасці інтарэсы простага чалавека, беларуская дзяржава стварыла ўмовы для роўнага доступу да адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, забяспечыла новыя стандарты якасці жыцця, захавала традыцыйныя і сфарміравала новыя галіны эканомікі, спрыяла зараджэнню новых сацыяльных груп.

Мэтанакіраваная палітыка па прырашчэнні чалавечага капіталу сфарміравала з боку грамадзян запыт на новы грамадскі дагавор. Ён замацоўвае прынцыпы ўзаемаадносін грамадзян з дзяржавай, якія ўспрымаюцца імі як справядлівыя.

Ва ўсходняй і заходняй традыцыях справядлівасць трактуецца па-рознаму. Для славян гэта хутчэй раўнамернае размеркаванне дабротаў, адказнасць дзяржавы за забеспячэнне годнага жыцця грамадзян. У заходніх грамадствах справядлівасць трактуецца як роўнасць у магчымасцях, роўная адказнасць дзяржавы і грамадзян за пабудову грамадства ўсеагульнага дабрабыту.

Сёння ў беларускай рэальнасці паралельна суіснуюць дзве ідэалагічныя канструкцыі канцэпту «справядлівасць». Узнаўленне адной з іх, якая трактуе «справядлівасць» як роўнасць у размеркаванні даброт, ідзе па сыходнай траекторыі, іншая, якая разглядае «справядлівасць» як роўнасць умоў, — па ўзыходзячай.

Асаблівасці рэсурснага забеспячэння эканомікі Беларусі актуалізуе патрэбу больш актыўна выкарыстоўваць інтэнсіўныя фактары эканамічнага развіцця, чэрпаць рэзервы ў інтэлектуальным, навукова-тэхнічным патэнцыяле нацыі. Гэтая тэндэнцыя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# форма выказвання адносін да свайго права існаванне і развіццё

добра «кладзецца» на сацыяльныя ўстаноўкі новага пакалення беларусаў, якія ўжо не з'яўляюцца носьбітамі савецкай ідэнтычнасці і схільныя ацэньваць дзяржаву як партнёра.

Мы ўшчыльную падышлі да таго скрыжавання, калі трэба адаптаваць беларускую мадэль дзяржаўнага ладу да запытаў ужо пасталелага грамадства. У такія перыяды вызначыць дакладны шлях здольныя толькі мудрасць і вышэйшая воля народа. Інстытут Усебеларускага народнага прадстаўніцтва неаднойчы даказваў сваю здольнасць пераадольваць крызісы развіцця: у пачатку XX стагоддзя беларускі народ выбіраў паміж двума праектамі БНР і БССР, у сярэдзіне 90-х — паміж шокавымі і сацыяльна арыентаванымі рэформамі ў эканоміцы.

**Вадзім ЛОСЕЎ:** Я выкладаю не толькі геаграфію, але яшчэ і грамадазнаўства. Мне гэта тэма вельмі цікавая з пазнавальнага пункту погляду. Бачу, што Усебеларускі народны сход — вялікая палітычная з'ява. І ацэнку ёй, вядома, будзем даваць не мы, а ўжо нашы нашчадкі.

Сачыў за Народным сходам 2016 года як за палітычным інструментам і звярнуў увагу на тое, што на яго дэлегіравалася вялікая колькасць простых людзей. Цяпер вельмі баюся, каб форум не стаў «пленумам ЦК КПСС», які складаецца цалкам з кіраўнікоў. Мне здаецца, што гэта будзе не зусім сумленна ў адносінах да працоўных.

Тыя, хто намі кіруе, людзі дастойныя, лідары, але не ўвасабляюць асноўнага зрэзу народа, тое, што для мяне — соль зямлі. Мне вельмі важна паглядзець на найлепшых прадстаўнікоў прафесій, дзякуючы якім і ствараецца дабрабыт. Кіраўнік кіруе, але цяжар працы ляжыць на плячах 7,5 мільёна беларусаў.

Усебеларускі народны сход 2016 года прыняў рэзалюцыю аб тым, што ўзровень якасці жыцця грамадзян нашай краіны будзе павышацца. Не хацелася б, каб у 2021 годзе прынялі пастанову пра тое, што сонца ўзыходзіць на Усходзе, а заходзіць на Захадзе. Відавочна, што ўсе мы хочам развіцця, росту заробкаў, больш якасных паслуг жыллёва-камунальнай гаспадаркі, змяншэння падатковага цяжару... Гэта супер! Гэта класныя ідэі, але дэкларацыяваць іх недастаткова.

Мне цікавыя канкрэтныя факты, і не з ідэалагічнага пункту гледжання — пра развіццё грамадзяніна, бо я чалавек не працэсу, а выніку. Мяне цікавіць, якая ў нас будзе інфляцыя, стаўка рэфінансавання, каб я мог разлічыць свой сямейны бюджэт, якім будзе прырост ВУП. На жаль, зараз я не маю гарызонту планавання, далягляду падзей на заўтра. Усё занадта хутка змяняецца, працэсы ў беларускім грамадстве непрадказальныя. У выніку работы VI Усебеларускага народнага сходу я хацеў бы даведацца, куды мы ідзём — вектар нашага развіцця.

## Наданне канстытуцыйнага статусу УНС

**Вадзім ЛОСЕЎ:** З-за таго, што ні ў Канстытуцыі, ні ў законах няма дакладнага азначэння, што такое Усебеларускі народны сход, мы не можам дакладна сказаць, якія ў яго функцыі. А гэта прынцыпова важнае пытанне.

Калі казаць з пункту гледжання грамадазнаўства, то нельга ні ў якім разе падмяняць Усебеларускім народным сходам рэферэндум. Нельга ставіць знак роўнасці. Калі мае персанальныя праблемы — простага чалавека — вырашыць рэферэндум, я за рэферэндум. Калі Усебеларускі народны сход — я за яго. Трэба выкарыстаць усе алоўкі ў гэтым пачку, які называецца «дэмакратыя па-беларуску», каб зразумець, што нам дапаможа. Ці рэалізавалі мы ўсе магчымыя варыянты, каб прыйсці да грамадскага кансэнсусу і, самае галоўнае, да паляпшэння жыцця грамадства? Ад паляпшэння жыцця мяне персанальна, як рацыянальнага эгаіста па Адаму Сміту, да паляпшэння жыцця грамадскага канструкта па Тойнбі.

Беларусь я ўяўляю канатаходцам. У канатаходцаў ёсць абавязковае правіла: увесь час ісці невялікімі крокамі і трымаць баланс. Калі ісці хутка, раўнавага парушыцца і адбудзецца падзенне. Калі занадта запаволіцца — тое самае. Нам трэба ўвесь час рухацца, нельга спыняцца, спяшацца і тармазіць. Галоўная мэта — рух. Калі Усебеларускі народны сход забяспечвае правіла канатаходца, значыць, мы робім правільна.

**Усё гэта патрабуе наяўнасці і іншых формаў народнага прадстаўніцтва, якія адначасова не павінны падмяняць сабой парламент, адзін з найбольш важных органаў улады.**

**Таццяна ШЭНДЗІК:** Чарговы этап развіцця нашай дзяржавы мусіць адбыцца ва ўмовах знешнепалітычнай турбулентнасці і барацьбы сусветных гульцоў за рэсурсы і ўплыў у рэгіёне. Наўрад ці даводзіцца спадзявацца на спакойныя часы — свет уступіў у эпоху глабальнай трансфармацыі. Любая сацыяльная сістэма ў перыяд развіцця і перафарматавання найбольш уразлівая да знешняга ўздзеяння, дзяржава не выключэнне. Каб забяспечыць адначасова развіццё эканамічнай, палітычнай сістэм і захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, суверэннай дзяржавы неабходна стварыць інстытут, які выступіць гарантам паспяховай трансфармацыі. Такім інстытутам можа стаць Усебеларускі народны сход як вышэйшая форма народаўладдзя. Надзяленне яго паўнамоцтвамі ў сферы ажыццяўлення грамадскага кантролю за выкананнем рашэнняў УНС, выкарыстання права вета ў дачыненні да рашэнняў, якія ідуць уразрэз з воляй народа, дасць магчымасць стварыць парасонавыя механізмы абароны дзяржаўнасці, распакаваўшы пры гэтым магчымасці для фарміравання новых пунктаў устойлівасці сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сістэм.

## Роля грамадскай дыскусіі

**Таццяна ШЭНДЗІК:** Грамадская дыскусія, якая папярэднічала Усебеларускаму народнаму сходу, дазволіла вызначыць прынцыпы грамадскага развіцця, якія беларускі народ бачыць умовай плённасці беларускай мадэлі ў будучыні. Гэта прынцыпы:

— умацавання дзяржаўнай улады, яе прагрэсіўнасці;

— уважлівага стаўлення да чалавека, уліку грамадскай думкі пры прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў;

— карыснасці грамадству, заахвочвання актыўнасці і ініцыятыўнасці, абгрунтаванай прафесійнай (кіраўніцкай) рызыкі;

— падтрымкі інтэлекту і прыярытэту моладзі;

— уліку нацыянальнай ідэнтычнасці, прыярытэту захавання нацыі;

— паслядоўнага, паступальнага прырастання вопыту;

— прыярытэту бяспекі над правамі чалавека;

— гарантыі інвестыцый і правоў уласнасці;

— адкрытасці і міратворчасці;

— непахіснасці суверэнітэту, недапушчальнасці знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы;

— прыярытэту дружалюбных адносін у знешнеэканамічнай дзейнасці.

Яшчэ раней эксперты заўважылі запыт супольнасці на ўдзел у кіраванні грамадскімі справамі. Маркерамі такога запыту стаў рост фактаў выкарыстання інфармацыйных платформаў у мэтах вырашэння пытанняў грамадска значнага характару (петыцыя за адмену Закона «Аб адтэрміноўцы»), актыўны водгук грамадзян на грамадскае абмеркаванне Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, а таксама паспяховая актыўнасць жыхароў супраць высечкі Грушаўскага сквера.

Ініцыятыва, а часам і вымушаная рэакцыя дзяржаўных органаў на нізавую актыўнасць даюць аптымізм меркаваць аб засваенні ўладай і ўкараненні ў абарот інструментаў камунікацыі па лініі «ўлада — грамадства», якія ў доўгатэрміновай перспектыве здольныя дапоўніць механізмы камунікацыі па лініі «ўлада — чалавек».

У адрозненне ад палітычна ангажаванай актыўнасці запыт на ўдзел у кіраванні грамадскімі справамі носіць ненакіраваны характар і сфармаваны пад уплывам натуральных абставін, а сацыяльна-бытавы характар актыўнасці насельніцтва мінімізуе яе таксічнасць і спрыяе маштабаванасці.

Сістэмная рознанакіраваная работа органаў улады з грамадскай энергіяй: ад надання імпульсу развіцця тэрытарыяльнаму самакіраванню да развіцця практык грамадскай экспертызы і кантролю — дасць магчымасць павысіць устойлівасць беларускай мадэлі развіцця.

**Але народ не абмяжоўваецца толькі арыстакратычнымі джэнтльменамі, якія іншых не прызнаюць вартымі і годнымі сябе.**

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Лічу надзвычай важным, каб пры мясцовых органах улады пастаянна дзейнічалі дыскусійныя пляцоўкі для розных грамадскіх ініцыятыў. Неабходна развіваць культуру дыскусіі, дыялогу. Яны павінны грунтавацца на фактах і аргументах, мець канструктыўную накіраванасць дзеля ўмацавання і паляпшэння развіцця нашай краіны, аб'ядноўваць, а не падзяляць. Надзвычай актуальна, каб кіруючыя органы, асабліва на месцах, чулі людзей, разумелі, што іх хвалюе і разам з імі вырашалі любыя праблемы.

Яшчэ біблейскія прарокі ў свой час гаварылі пра прагматычных следапытаў, якія вядуць за сабой народ праз хаос і сумяціцу, сеючы зерне новага шляху. У сучасных умовах такімі следапытамі, а не толькі добрымі прафесіяналамі ў сваёй справе, павінны быць менавіта кіруючыя кадры нашай краіны. Дзеля гэтага яны павінны не толькі валодаць перадавымі навукова-арганізацыйнымі ведамі, але і мець глыбокую грамадзянска-патрыятычную перакананасць, высокі духоўны патэнцыял і пачуццё адказнасці за лёс Айчыны і ўсяго беларускага народа. Адзначу, што гэты пасыл ужо пакладзены намі ў аснову вучэбна-выхаваўчых планаў і вучэбна-арганізацыйнай работы кафедраў і ўсіх структур Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

## Дзяржава і моладзь

**Таццяна ШЭНДЗІК:** Можна сказаць, што будучыня Беларусі фарміруецца сёння. І якім стане гэта будучыня, шмат у чым залежыць ад сучаснага пакалення моладзі, яе сталасці і здольнасці разабрацца ў хітраспляценнях светабудовы, уменні правільна расставіць акцэнты і адказаць за свае ўчынкі.

Дзяржава з'яўляецца свайго роду арбітрам, які стварае ўмовы для станаўлення юнакоў і дзяўчат.

**Народны сход забяспечвае легальнасць дзеяў і кантралюе дзейнасць пастаянных органаў, прадстаўляе інтарэсы шырокіх мас.**

Сфарміраваная ў перыяд устойлівага эканамічнага росту і стабільнасці беларуская моладзь дэманструе павышаныя патрабаванні і сацыяльны перфекцыянізм, арыентаваны на навязаныя, часцяком нерэальныя стандарты дасканаласці. Зваротным бокам такога перфекцыянізму становіцца боязь няўдачы, празмерная адчувальнасць да ўсякай крытыкі. Пры гэтым юнацкія мары аб лёгкім, цікавым і актыўным жыцці, калі разбіваюцца аб суровыя рэаліі, часам фарміруюць адчуванне ўласнай неплацежаздольнасці і нерэалізаванасці.

У першую чаргу маладому пакаленню патрэбна самарэалізацыя, а для гэтага важна стварыць неабходныя ўмовы, сучасныя, прывабныя стандарты жыцця і вучобы, шырокія магчымасці для дасягнення поспеху.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Неабходна з ранняга дзяцінства выхоўваць моладзь у духу любові і павагі да продкаў і Радзімы, фарміраваць імкненне да стваральнай працы, да ведаў і разумення гісторыі, уменне самастойна думаць і развіваць творчыя здольнасці на карысць грамадства.

Вельмі важна, што ў нашай краіне адбылася трылогія «Малой радзімы». Сапраўдны патрыятызм пачынаецца з любові да родных мясцін, дзе ты нарадзіўся, і дзе ты жывеш. Прыемна адзначыць, што сустрэчы вучоных-гісторыкаў з грамадскасцю, правядзенне навуковых форумаў, прысвечаных даследаванню мінулага асобных населеных пунктаў і рэгіёнаў Беларусі, распачатыя па ініцыятыве Інстытута гісторыі НАН Беларусі, сталі добрай і карыснай традыцыяй. Акрамя таго, рэгулярна арганізуюцца археалагічныя летнікі.

Усё гэта з'яўляецца непасрэднай, практычнай ідэалагічнай работай, накіраванай на кансалідацыю беларускай нацыі, гарманізацыю грамадскіх адносін, фарміраванне патрыятызму, грамадзянскай актыўнасці і адказнасці, захаванне культурна-гістарычнай пераемнасці і гістарычнай свядомасці. Такая практыка павінна пашырацца з дапамогай сталічных і рэгіянальных ВНУ на ўсе раёны нашай краіны.

**Вадзім ЛОСЕЎ:** Лічу, што любыя рэформы трэба пачынаць з сістэмы адукацыі. Размова не пра колькасць вучэбных гадзін, бальнасць ацэнкі ведаў, а пра літасферныя, мацерыковыя зрухі. Бо мэта беларускай адукацыі — стварэнне ўсебакова і гарманічна развітой асобы. У іншых краінах мэты больш канкрэтныя: выхаванне годнага грамадзяніна, гатовага да жыцця (у Паўночнай Еўропе), да працы і абароны (у Кітаі), чалавека, здольнага выжыць (у афрыканскіх краінах). Куды ў беларускай адукацыі рухаемся мы? Ці не топчамся на месцы?

Калі Усебеларускі народны сход вызначыць адну мэту беларускай адукацыі (няхай гэта будзе патрыятызм або выхаванне матэматычнай нацыі), педагагічная супольнасць будзе яе дасягаць. Дайце нам адну найважнейшую мэту, і мы яе рэалізуем.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# БУНКЕР ЧАСОЎ «ХАЛОДНАЙ ВАЙНЫ»

## Якую функцыю выконваюць сёння падземныя сховішчы

**Падземны бункер часцей за ўсе асацыюецца з кадрамі ваеннай кінахронікі. У час бамбёжкі людзі імкнуцца да аб'ектаў, на якіх вялікімі літарамі напісана «бамбасховішча». Зараз такога паняцця няма, хоць абаронныя аб'екты існуюць і прызначаны для ўкрыцця падчас надзвычайных сітуацый. У Гродне іх амаль сотня. Штогод сярод абаронных збудаванняў нават вылучаюцца найлепшыя, так бы мовіць, бункеры ўзорнага ўтрымання. Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў сховішчы аднаго з гродзенскіх заводаў.**



### МАСІЎНЫЯ ДЗВЕРЫ — ЯК У КІНО...

З прадстаўніком МНС, які будзе суправаджаць падчас наведвання аб'екта, мы сустракаемся каля прахадной завода. Мікалай ПАНЧЫШНЫ называе сваю пасаду з даволі доўгай назвай. Ён — інжынер сектара арганізацыі функцыянавання дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны Гродзенскага гарадскога аддзела па НС.

Праходзім за прахадную завода і спыняемся перад дзвярнымі кратамі, за якімі бачны спуск у падвал. Сюды мы накіроўваемся разам з Сяргеем НАСУЛЬКАМ, які ўзначальвае штаб грамадзянскай абароны на прадпрыемстве. Ён папярэджвае, што аб'ект на капітальным рамонце. Так робіцца праз кожныя дзесяць гадоў.



— Не будзем забываць, што гэта падвал, тут і вільгаць можа быць, і грунтавыя воды праступаюць, абсталяванне гніе, іржавее, трэба за гэтым сачыць, фарбаваць, праветрываць, — каментуе на хаду начальнік ГА завода.

І вось мы ўжо на глыбіні чатырох метраў пад зямлёй...

Прызнаюся, бываць у падземных памяшканнях даводзілася не раз. У Гродне нямала старажытных будынкаў з глыбокімі падваламі і хадамі. Асабліва гэта датычыцца храмаў і замкаў. У некаторых нават месцяцца выставачныя экспазіцыі. Падвальчыкі ў цэнтры горада прыстасаваныя пад кафэ ці крамы. А вось наведаць сапраўднае сховішча не даводзілася. У памяці зачапіліся, мабыць, з кінафільмаў, масіўныя металічныя дзверы з такім жа металічным колам-вінтом. Здагадваюся, што ён прызначаны для герметычнага задрайвання памяшкання.

Сапраўды, дзверы — першае, што кінулася ў вочы ў падвале. Іх тут некалькі. Яны ставяцца яшчэ і на аварыйным выхадзе, які праз тунэль вядзе на вуліцу. Начальнік ГА завода правярае механізм работы металічных дзвярэй. Усё працуе, але гума на дзвярах патрабуе замены. Гэта плануецца зрабіць у ходзе рамонту.

### МАБІЛЬНІК ТУТ НЕ ЦЯГНЕ

Увогуле падземны бункер — даволі прасторны аб'ект, хоць у разбіты на некалькі памяшканняў. Усе яны маюць свае, строга вызначаныя функцыі. Святая святых — вентыляцыйная камера. Пункт забяспечвае сховішча чыстым паветрам, якое паступае з вуліцы, праходзіць праз фільтры і па трубаправодах ідзе ў памяшканні. Як растлумачыў Мікалай Панчышны, нават хімічна і радыяцыйна заражанае паветра тут пройдзе ачыстку.

Ёсць і нормы, у які колер фарбаваць трубы. Напрыклад, жоўтая — з неачышчаным паветрам, белая — з чыстым. Па зялёных цячэ вада. У карычневы колер пафарбавана сістэма ацяплення, у чорны — каналізацыя.

Пры запоўненым памяшканні раз-пораз трэба ўключаць вентыляцыю. Мае спадарожнікі заўважаюць, што гэты гук — з ліку таго, што можа стварыць дыскамфорт для прысутных. А яшчэ тут няма мабільнай сувязі. Правяраю і бачу — так і ёсць. Жартую, што гэты факт якраз-такі для многіх і можа стаць надзвычайнай сітуацыяй. Між тым сувязь са знешнім светам не страчваецца. Для гэтага тут ёсць правадны тэлефон і радыёстанцыя. Але адчуванне адарванасці ад рэальнага свету даволі вострае. Не вельмі верыцца, што недзе зверху ідзе звычайнае гарадское жыццё. Сюды праз тоўстыя сцены, на чатырохметровую глыбіню ніводны гук не пранікае.

### КАБ ЛЮДЗЯМ БЫЛО СПАКОЙНА

Між тым экскурсія па бункеры працягваецца. Уражваюць рэзервуары для аварыйнага запасу пітной вады на чатыры тысячы літраў. За іх станам сочаць санэпідслужба. Аварыйнае асвятленне забяспечвае аўтаномная дызельная станцыя. Такая колькасць розных механізмаў павінна забяспечыць нармальную жыццядзейнасць 600 чалавек у замкнутай прасторы. І нават у такіх экстрэмальных умовах прадугледжаны спальныя месцы. У асобным пакоі абсталяваны двухпавярховыя нары. Дарэчы, спальныя месцы павінны займаць трэцюю частку аб'екта. Цяпер на нарах знаходзяцца прадметы грамадзянскай абароны, у тым ліку процівагазы.

Ёсць тут і медпункт, і санвузел, і прадуктовы склад.

— Зараз, вядома, прадуктаў тут няма. Яны заносяцца пры аб'яўленні надзвычайнай сітуацыі. На працягу 12 гадзін сховішча павінна быць падрыхтавана, усё лішняе выносіцца, з баз паступаюць прадукты з разлікам на пяць сутак. Гэта кансервы, крупы, сухія кашы, якія можна варам заліць. На раздачы стаіць халадзільнік, тут ёсць і акенца для выдачы пайка. Для абслугоўвання на заводзе створана асобнае звяно з ліку работнікаў. Кожны адказвае за свой участак, — тлумачыць Сяргей Насулька.

Ёсць і тыя, хто сочыць за абстаноўкай, за парадкам. Каб людзі паводзілі сябе спакойна. Згодна з правіламі, сюды нельга заходзіць з жывёламі. Дарэчы, з інструкцыяй можна азнаёміцца на праваым партале. Раней яна была прызначана толькі для службовага карыстання, але цяпер у шырокім доступе. Такая інфармаванасць павінна супакойваць насельніцтва, лічыць Мікалай Панчышны.

### У ВЫПАДКУ ПАГРОЗЫ...

Самы прасторны пакой — для знаходжання эвакуіраваных грамадзян. Цяпер ён выконвае ролю класа. Тут за сталамі праходзяць заняткі па грамадзянскай абароне для работнікаў завода. Раз на месяц вядзецца праверка сістэмы апавяшчэння. Такі ж сігнал будзе гучаць падчас пагрозы. Разам з ім выратавальнікі праз электронныя СМІ паведамяць насельніцтву пра далейшыя дзеянні.



Якія гэта пагрозы? Па словах супрацоўніка МНС, сюды адносяцца ваенныя дзеянні, хімічныя і радыяцыйныя аварыі на прадпрыемствах, стыхійныя бедствы.

— А ці былі сітуацыі, калі сховішча працавала па сваім прызначэнні? І якіх надзвычайных сітуацый трэба зараз баяцца? — задаю пытанне.

На шчасце, ні гэтае, ні іншыя сховішчы горада не былі задзейнічаны па прамым прызначэнні, хоць будаваліся яшчэ ў 50-я гады. Гэтак жа мірна тут перажылі і часы «халоднай вайны». Ды і стыхійных катаклізмаў такіх маштабаў у рэгіёне не назіралася, зазначыў Мікалай Панчышны.

### УВАХОД АБМЕЖАВАНЫ?

Гэта так. Трапіць у такое сховішча дзеля цікаўнасці не атрымаецца. Між тым закон не забараняе здаваць іх у арэнду ці выкарыстоўваць для патрэб прадпрыемства. Сховішчы могуць «працаваць» і ў мірных мэтах. Дзе-нідзе так і адбываецца. Праўда, нельга рабіць перапланіроўку.

Хтосьці абсталёўвае там склады, дзесьці падземныя памяшканні аддаюцца пад спартыўныя залы. Ёсць прыклады стварэння ціра, зноў жа «трэнажоркі» і нават лазні. Некаторыя прадпрыемствы робяць бытоўкі для работнікаў з душавымі кабінкамі. На адным з самых вялікіх у горадзе сховішчаў доўгі час працаваў фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Яшчэ адзін аб'ект каля абутковай фабрыкі будзе выкарыстоўвацца для захавання прадуктаў аднаго гандлёвага прадпрыемства.

Мне растлумачылі, што абаронныя аб'екты як выконвалі свае функцыі, так і выконваюць. Іх фонд дазваляе поўнасцю забяспечыць ахову насельніцтва на працягу тэрміны — ад двух да пяці сутак у залежнасці ад класа абароны. Сярод арганізацый нават наладжана спаборніцтва на найлепшае ўтрыманне абароннага аб'екта. Па выніках конкурсу прысуджаюцца прэміі.

Экскурсія падалася мне вельмі цікавай. Дарэчы, падчас прафілактычных акцый такія экскурсіі праводзяцца і для дзяцей. А можа варта было б зладзіць падобныя вандроўкі для ўсіх ахвотных? Экскурсаводы — у гэтым выпадку супрацоўнікі МНС — добра падрыхтаваны. Можна было б уключыць у гарадскі турыстычны маршрут і такі цікавы аб'ект...

Дарэчы, такі прэцэдэнт у Гродзенскай вобласці ёсць. У Шчучынскім раёне існуе музей «халоднай вайны», які створаны ў былым сакрэтным бункеры для лётчыкаў. І ёсць нямала ахвотных убачыць прылады жыццезабеспячэння падземнага каманднага пункта. Лічу, што і ў Гродне турыстам было б што паказаць у савецкім бункеры.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Здарэнне

# Выяўлены схрон з выбухоўкай

**Гомельскімі пагранічнікамі сумесна з групай размініравання вайсковай часці 5525 унутраных войскаў МУС Беларусі і супрацоўнікамі Хойніцкага РАУС знойдзены боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Па інфармацыі ад мясцовых жыхароў, у лясным масіве ў 1,5 кіламетра ад населенага пункта Майскі Брагінскага раёна і ў 300 метрах ад аўтазаправачнай станцыі паблізу населенага пункта Хойнікі была выяўлена вялікая колькасць выбуховага рэчыва і боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны: 547 адзінак трацілавых шашак нямецкай вытворчасці агульнай вагой 109,4 кілаграма, пяць рэактыўных снарадаў калібрам 158,5 міліметра, супрацьтанкавая міна, артылерыйскі снарад калібрам 75 міліметраў, пяць артылерыйскіх узрывальнікаў. Групай размініравання вайсковай часці 5525 праводзяцца неабходныя мерапрыемствы па размініраванні і знішчэнні выяўленых трацілавых шашак і боепрыпасаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Навінкі

# МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА РАСПАЧЫНАЕ КНІГАВЫДАННЕ

**Адразу тры кнігі народнага песняра Беларусі Якуба КОЛАСА пабачылі свет дзякуючы замове Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа**

Да чытача краіны на роднай мове прыйшлі «Міхасёвы прыгоды», «Савось-распуснік. Рак-вусач», «Якуб Колас — дзецям». Выдаўцамі выступілі «Белстан» і «Альфа-кніга». Наклад у кожнага з выданняў — 200 экзэмпляраў. У праекта ёсць рэдакцыйная калегія, куды ўвайшлі: А. В. Храмы, В. В. Міцкевіч, А. І. Красоціна, У. А. Ліхадзедаў. Да паэмы «Міхасёвы прыгоды» праўнучка Якуба Коласа, галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Васіліна МІЦКЕВІЧ, напісала лаканічную і выразную прадмову, у якой пераканаўча сведчыць, што: «У беларускай літаратуры для дзяцей наўрад ці знойдзецца другая такая кніга, якая б так прыгожа і маляўніча, проста, яскрава і вобразна паказала маленькаму чытачу багацце і разнастайнасць роднай прыроды». І вось што яшчэ піша Васіліна Міцкевіч: «Міхасёвы прыгоды» Якуб Колас пісаў з асаблівай любоўю, бо прататыпам галоўнага героя твора быў яго малодшы сын Міхась. Міхаіл апісаны на аснове рэальных падзей, што адбываліся з ім у дашкольным узросце, а многія дзеючыя асобы паэмы: яго родныя браты — Даніла і Юрка, хлопчыкі і дзяўчынкі, з якімі ён сябраваў, — названы іх сапраўднымі імёнамі. Зачараванасць прыгажосцю прыроды роднага краю, любоў да рыбалкі, збору грыбоў і ягад, якія так паэтычна апісаны ў паэме, захаваліся ў Міхася Канстанцінавіча на ўсё жыццё».



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Да кнігі «Савось-распуснік. Рак-вусач» прадмову напісала старшыня грамадскага аб'яднання «Дзіцячы фонд духоўнага і культурнага адраджэння «Сакавік», унучка Якуба Коласа Марыя МІЦКЕВІЧ. «Якуб Колас вельмі добра разумеў неабходнасць у дзіцячых творах, у якіх на роднай беларускай мове распавядалася б пра розныя з'явы прыроды, жыхароў лясоў, азёраў і рэчак. Ён вучыў беражлівым адносінам да ўсяго жывога, адмоўна ставіўся да забойства жывёл і палявання, хоць і быў адным з лепшых стралкоў у Аляксандраўскім ваенным вучылішчы. Любімым заняткам класіка быў збор грыбоў. У лепшыя гады ён прыносіў за адзін раз больш за 200 баравікоў са сваіх лясных вандровак. Якуб Колас вучыў сыноў, як правільна збіраць грыбы і як захоўваць грыбніцу. Любіў ён і вудзіць рыбу, у тым ліку і са сваім сябрам і паплечнікам Янкам Купалам. Напэўна, таму так яскрава ў паэме «Рак-вусач» Якуб Колас апісвае рачных жыхароў, раскрывае перад дзецьмі чароўны падводны свет».

Усе тры кнігі маляўніча аформіла таленавіты кніжны графік Алеся ЖЫТКЕВІЧ. Зробленыя ёй ілюстрацыі арганічна ўпісваюцца ў вымаўленыя Якубам Коласам мастацкія вобразы, параўнанні. Мастачка і расклала малюнкі па старонках кніг так спрактыкавана, вобразна, што часам здаецца, адкрыўшы ўжо тэксты паэм і вершаў, можна яшчэ раз «перачытаць» і самі ілюстрацыі. Чаго варты адзін толькі разварот, дзе «Рыба з радасці такой / Пайшла ў скокі талакой...», дзе «Муха на цымбалах / Струны калыхала...», «Граў на скрыпачцы камар, / На дудачцы — чмель-дудар»...

...Не за гарамі вясеннія канікулы. Па традыцыі розныя бібліятэкі, у тым ліку і школьныя, будуць ладзіць Тыдзень дзіцячай і юнацкай літаратуры. Знаёмства з новымі выданнямі твораў Якуба Коласа, адрасаваных юнаму чытачу, — добрая нагода для прэзентацый, для сустрэч і ў Коласаўскім музеі, які апошнім часам, нягледзячы на складанасці работы ва ўмовах пандэміі каранавіруса, уражвае рознымі цікавымі праектамі.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Юбілей

# АД БУКВАРА ДА «НОН-ФІКШН»:

## 100-гадовы юбілей выдавецтва «Беларусь»

**Сто гадоў — юбілей салідны... Колькі за гэты час у выдавецтве «Беларусь» з'явілася адметных кніг, колькі незвычайных падзей адбылося! Пра доўгі і пачэсны шлях, набыткі і перспектывы выдавецтва распавялі на прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы. Тым больш што хутка чытачы змогуць наведаць экспазіцыю «Беларусі» на Міжнароднай кніжнай выстаўцы, якая пройдзе з 18 да 21 лютага, і ўжо цяпер выдаўцы клапоцяцца пра тое, чым нас здзівіць.**

— 100-гадовы юбілей — гэта вельмі шмат, каб застацца звычайным карпаратыўным святам, — кажа **дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН**, — Гэта больш маштабная з'ява. Па-сутнасці, векавая дзейнасць выдавецтва — частка гісторыі беларускай культуры і нават гісторыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Калі пачалося беларускае друкарства, акцэнт рабіўся на паліграфіі: друкаваліся пераважна рэлігійныя, кананічныя тэксты. І тая дзейнасць, якую сёння мы называем выдавецкай, то-бок рэдактура, падрыхтоўка рукапісу, была не вельмі запатрабаванай. Асноўнай задачай было стварыць фізічны аб'ект — кнігу, якую можна трымаць у руках. Пасля таго як у нас з'явілася першае выдавецтва «Беларусь», мы паступова перайшлі ад тэрміна «кнігадрукаванне» да «кнігавыдавецтва». Правялі мяжу паміж паліграфіяй і выдавецкай справай.

Калі ствралася першае выдавецтва, яно было шматфункцыянальнае — у ім выдавалася і вучэбная, і навукова-тэхнічная, і агітацыйна-прапагандысцкая літаратура. Толькі ў 1951 годзе на базе выдавецтва «Беларусь» вылучылася «Народная асвета», а ў 1972-м ад нас аддзялілася «Мастацкая літаратура», якая таксама была структурным падраздзяленнем. Ствараўся цэнтр, які развіваў і пашыраў выдавецкую справу ў Беларусі. У тым ліку ставіліся задачы, якія застаюцца актуальныя і сёння: выяўленне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. З самага пачатку была ўстаноўка на дамінаванне кніг на беларускай мове: іх выдавалася больш за 70 %. І сёння мы імкнёмся папаўняць на кніжным рынку тыя тэматычныя нішы, па якіх можна ідэнтыфікаваць нашу краіну.

**Дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр СУША** дадае:

— Пастанова ад 18 студзеня 1921 года аб стварэнні выдавецтва «Беларусь» — адно з самых важных і знакавых рашэнняў. Але ў яго ёсць і перадгісторыя, бо ўжо ў снежні 1920-га выдавецтва пачало сваю работу. Пра гэта ёсць як успаміны, так і канкрэтныя згадкі. Але трэба адзначыць, што Беларускае дзяржаўнае выдавецтва на самым першым этапе свайго існавання — гэта філіял расійскага Дзяржвыдата. Па-сутнасці, выдавецтва выпускала расійскую прадукцыю. Напрыклад, адным з самых масавых буквароў першага этапу яго дзейнасці быў буквар Элькінай — кніга, па якой вучылася ўся савецкая Расія. Спачатку яна ўбачыла свет у Маскве, потым у Гомелі, бо Гомель тады яшчэ ўваходзіў у склад РСФСР, а затым ужо была перадрукавана ў Мінску Дзяржаўным выдавецтвам БССР. Выдавецтва пачынала сваю гісторыю ад ролі філіяла. Але вельмі хутка, ужо ў 1921 годзе, усвядоміла сябе як нешта большае. І сапраўды перайшло ад статусу друкарні да выдавецтва. Гэты пераход быў выключна важны для беларускай культуры: ён засведчыў фарміраванне дзяржавы і нацыі.

Гісторыя кнігадрукавання ў Мінску пачынаецца з 1790 года. Гэта мінская базыльянская друкарня, якая з 1795 года стала Мінскай губернскай друкарняй. І фактычна на яе аснове ўзнікла тое выдавецтва, пра якое мы гаворым. У 1917 годзе, адразу пасля рэвалюцыі, 19 снежня было прынята рашэнне аб нацыяналізацыі прыватных друкарняў. Але да 1921 года паўнавартаснае выдавецтва стварыць так і не атрымалася. У гэты час, нягледзячы на існаванне фармальнага статусу, беларусы пачалі казаць: «Мы не можам быць проста філіялам. Нам трэба мець сапраўднае выдавецтва». Гэта было звязана з тым, што ў БССР пачалі развіваць беларускую асвету. Грамадства саспела да разумення неабходнасці падтрымкі ўласнай мастацкай літаратуры. Гэта ўсё прастымулявала наркам асветы, у структуры якога было выдавецтва. Пачалася падрыхтоўка: кнігі пісаліся адна за адной, з'явіліся першыя падручнікі. Нягледзячы на нацыяналізацыю, у Мінску паліграфісты вельмі моцна супраціўляліся з'яўленню беларускага выдавецтва, матывуючы гэта адсутнасцю шрыфтоў і паперы. Яны лічылі, што попыт на беларускамоўную літаратуру будзе невялікім, таму жадалі застацца філіялам Расійскага дзяржаўнага выдавецтва. Падзмагаўшыся некалькі месяцаў з паліграфічным упраўленнем, наркам асветы пастанавіў... выдаць падручнікі за мяжой, у Берліне. Сёння гэта дзіўна, але першыя савецкія буквары друкаваліся ў Берліне! Апошняе паказала ўвесь нонсэнс сітуацыі: калі можна друкаваць у Германіі, то што замінае друкаваць у Беларусі?

Выдавецтва значна пашыралася і ў 1922 годзе аформілася канчаткова. Яно мела шмат памяшканняў па горадзе: крамы, друкарні.

Сёння прадукцыя выдавецтва пазнавальная і адметная, асвойваюцца самыя розныя тэмы і жанры — ад дыхтоўнага мастацкага альбома да актуальнай «нон-фікшн».

**Вядучы спецыяліст выдавецтва Анжэла САДОЎСКАЯ** удакладняе:

— Мы не маглі не адрэагаваць і на тое, што мінулыя гады былі прысвечаны тэме малой радзімы. Наша выдавецтва выпусціла больш за 20 кніг, прысвечаных гэтай нагодзе. Таксама хацелася б адзначыць, што ў кнігарні «Светач» арганізавана выстаўка, якая будзе працаваць да канца лютага. Там прадстаўлены кнігі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі і нашы сучасныя выданні. Запрашаем усіх ахвотных наведаць гэтую выстаўку.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Чытаем разам

# УТУЛЬНЫ СВЕТ

## Кніга для дзіцяці павінна быць напісана так, каб і дарослы знаходзіў у ёй цікавосткі

